*УДК [327:378.245](476)”1992/2022”*

# ДАСЛЕДАВАННЕ МІЖНАРОДНА-ПАЛІТЫЧНАЙ ПРАБЛЕМАТЫКІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ НА ДЫСЕРТАЦЫЙНЫМ УЗРОЎНІ Ў 1992-2022 гг.

**А.В. Гурын**

*Кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык аддзела дактарантуры і аспірантуры Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Мінск, Беларусь, gurin@pac.by*

Работа прысвечана аналізу выніковасці абароны дысертацыяў па міжнародна-палітычнай праблематыцы ў Рэспубліцы Беларусь у 1992-2022 гг., а таксама агульнай характарыстыцы тэматыкі дысертацыяў па навуковай спецыяльнасьці “Палітычныя праблемы міжнародных адносін, глабальнага і рэгіянальнага развіцця” і звязаных з ёю.

***Ключавыя словы:*** міжнародныя даследаванні; гістарыяграфія міжнародных адносін; дысертацыя; савет па абароне; палітычныя праблемы міжанародных адносін.

# RESEARCH OF INTERNATIONAL POLITICAL ISSUES IN THE REPUBLIC OF BELARUS AT THE DISSERTATION LEVEL IN 1992-2022

**A. V. Huryn**

*Candidate of Historical Sciences, Aassociate professor, Head of the Department of Doctoral and Postgraduate Studies.*
*Academy of Public Administration under the aegis of the President of the Republic of Belarus, Minsk, the Republic of Belarus, gurin@pac.by*

The article is devoted to the analysis of the effectiveness of defending dissertations on international political issues in the Republic of Belarus in 1992-2022, as well as the general characteristics of the topics of dissertations on the scientific specialty "Political problems of international relations, global and regional development" and related ones.

***Keywords:*** international studies; historiography of international relations; dissertation; defense council; political problems of international relations.

Міжнародна-палітычныя даследаванні ў Беларусі атрымалі сваё развіццё толькі ў пач. 1990-х гг. Пры гэтым, у адрозненне ад гістарычных даследаванняў міжнародных адносін, у савецкі перыяд у галіне палітычнай навукі не склаліся пэўныя даследчыя традыцыі і інстытуцыянальныя адзінкі; міжнародна-палітычныя даследаванні на фоне агульнапалітыч-

ных накірункаў таксама насілі параўнальна эпізадычны характар. Аднак, развіццё міжнародна-палітычнай галіны у сферы распрацоўкі і абароны дысертацыйных даследаванняў можна лічыць досыць выніковым, у першую чаргу за кошт абароненых 4 доктарскіх дысертацый; пры гэтым, 3 з 4 дактароў навук (Я. В. Матусевіч пайшоў з жыцця) актыўна і плённа працуюць у галіне палітычных навук.

Найбольш даследаванымі тэмамі ў галіне палітычных навук ў постсавецкі перыяд сталі праблемы тэарэтычных падыходаў да даследавання міжнародных адносін, глабалізацыі і рэгіяналізацыі; ролі рэгіянальных саюзаў і аб'яднанняў у міжнародных адносінах і сусветнай палітыцы; месца і ролі Рэспублікі Беларусь у сучасных міжнародных адносінах і сусветнай палітыцы.

**Тэарэтычныя падыходы да даследавання міжнародных адносін** (як правіла, на прыкладзе асобных дзяржаў) у 1992-2022 гг. даследавалі ў сваіх кандыдацкіх дысертацыях Ю.І. Малевіч [1], А.А. Плашчынскі [2], Д.А. Пузыроў[1] [3], І.Ю. Рублеўскі[2] [4], А.Л. Шаўцова [5].

Паднакірункам названай тэматыкі можна назваць ***даследаванне зместу і асаблівасцяў глабалізацыі,*** як працэса сусветнай палітыкі і міжнародных адносін. Даследаванне праблемаў паднакірунку ажыццяўлялі ў кандыдацкіх дысертацыях Азгар Абдзі [6], Г.Ю. Волкаў [7], В.М. Грынёва [8].

Доктарская дысертацыя С.А. Кізімы прысвечана выяўленню геапалітычных аспектаў развіцця нацыянальнай дзяржавы ва ўмовах глабалізацыі для ўдасканалення беларускай мадэлі грамадскага развіцця. У дысертацыі раскрыты асаблівасці развіцця нацыянальнай дзяржавы ва ўмовах глабалізацыі; вызначаны асаблівасці працэсаў глабалізацыі; вывучаны перашкоды на шляху ўкаранення заходняй ліберальна-дэмакратычнай мадэлі ў незаходніх нацыянальных дзяржавах; выяўлена геапалітычнае значэнне сістэмных выклікаў заходняга глабалізацыйнага праекту; выяўлены геапалітычны патэнцыял беларускай мадэлі развіцця [9].

У дысертацыі Ю.І. Малевіч абгрунтавана інтэрцывілізацыйная канцэпцыя правоў чалавека ва ўмовах глабалізацыі, якая з'яўляецца асновай усталявання справядлівых і партнёрскіх адносін паміж краінамі сусветнай супольнасці. Аўтарам даказана неабходнасць новых міжнародных рашэнняў, накіраваных на забеспячэнне абароны правоў чалавека на ўзроўні ААН, ва ўмовах пераарыентацыі вектараў геапалітычнага ўзаемадзеяння, якія маюць прынцыповае значэнне для выз-

[1] Адкрытая інфармацыя аб выніках абароны адсутнічае.
[2] Адкрытая інфармацыя аб выніках абароны адсутнічае.

начэння знешнепалітычнай стратэгіі Рэспублікі Беларусь ва ўмовах глабалізацыі [10].

**Месца і роля рэгіянальных саюзаў і аб'яднанняў у міжнародных адносінах і сусветнай палітыцы** стала прадметам кандыдацкіх дысертацый П.А. Барахвостава [11], М.Ю. Верамеева [12], А.А. Дастанка [13], І.С. Кузняцовай [14], А.У. Шаўчэнкі [15]. Большасць гэтых даследаванняў прысвечана Еўрапейскаму Саюзу, як найбольш развітай форме міждзяржаўнай інтэграцыі на сучасным этапе.

Найбольшая колькасць дысертацыяў па палітычных навуках была прысвечана **праблемам месцу і ролі Рэспублікі Беларусь у сучасных міжнародных адносінах і сусветнай палітыцы**. Гэта праблематыка знайшла адлюстраванне ў доктарскіх працах Я.В. Матусевіча [16] і Р.А. Есіна [17], кандыдацкіх працах А.А. Гарэліка [18], Д.У. Галубнічага [19], С.А. Ломава [20], Д.М. Любкіна [21], А.С. Пісарчык [22], В.А. Саковіча [23], А.В. Свірыдава [24], В.А. Серабракова [25].

У доктарскай дысертацыі Р.А. Есіна выяўлены палітычныя фактары і напрамкі развіцця палітыкі трансгранічнага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь у еўрапейскай перспектыве і распрацаваны практычныя рэкамендацыі па пытаннях рэгіянальнага і трансгранічнага супрацоўніцтва з краінамі–членамі ЕС. У дысертацыі упершыню рэгіянальнае вымярэнне палітыкі трансгранічнага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь у еўрапейскай перспектыве стала прадметам паліталагічнага навуковага даследавання; раскрыты мнагафактарны характар трансгранічнага супрацоўніцтва, устаноўлена яго трансфармацыя ва ўмовах дынамічнага развіцця інтэграцыйных працэсаў на ўсходзе і захадзе Еўропы [17, с. 38].

Такім чынам, вынікам падрыхтоўкі навуковых кадраў найвышэйшай кваліфікацыя ў галіне міжнародна-палітычных даследаванняў у краіне ў 1992-2022 гг. стала абарона 4 доктарскіх і 19 кандыдацкіх дысертацый па спецыяльнасці 23.00.04 – “Палітычныя праблемы міжнародных адносін, глабальнага і рэгіянальнага развіцця”, што складае прыкладна 0,77 дысертацыі за год.

Таксама кандыдацкія дысертацыі па міжнароднай тэматыцы былі абаронены па спецыяльнасцях 23.00.01 – “Тэорыя і філасофія палітыкі, гісторыя і метадалогія палітычнай навукі” – 1 дысертацыя; 23.00.02 – “Палітычныя інстытуты, працэсы і тэхналогіі” – 1 дысертацыя.

Нягледзячы на пэўныя поспехі ў развіцці міжнародна-палітычнай навукі на ўзроўні распрацоўкі і абароны дысертацыяў, трэба адзначыць, што ўласная навуковая школа ў гэтай галіне знаходзіцца ў стане фарміравання. Прычынай гэтага можна назваць пэўную раз'яднанасць даследчыкаў, большасць з якіх – практычныя работнікі ў галіне

дзяржаўнага кіравання. Фактычна на сённяшні дзень праблематыка даследуецца ў межых некалькіх кафедраў БДУ і Акадэміі кіравання. Таму карысным для далейшага развіцця міжнародна-палітычнай навукі ў Беларусі магло б стаць стварэнне самастойнай навуковай адзінкі ў гэтай галіне.




Колькасць дысертацый па міжнародна-палітычнай праблематыцы, абароненых у 1992-2022 гг. у Рэспубліцы Беларусь

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Малевич Ю. И.* Отражение принципов концепции прав человека во внешнеполитических доктринах США (70–80–е годы): Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.01 / Бел. гос. ун–т. Минск, 1995. 18 с.

2. *Плащинский А. А.* Внешнеполитическая стратегия лидерства США: формирование и развитие: Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.02 / Бел. гос. ун–т. Минск, 2005. 18 с.

3. *Пузырёв Д. А.* Исламский радикализм в мировой политике: Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун–т. Минск, 2018. 25 с.

4. *Рублевский И. Ю.* Место и роль политических институтов Бразилии в международном и региональном сотрудничестве: Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун–т. Минск, 2018. 25 с.

5. *Шевцова А. Л.* Влияние внутренних политических регионов национального государства на его внешнюю политику (на примере Польши, Литвы, Латвии): Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.04 / Акад. упр-ия при Презид. Респ. Беларусь. Минск, 2014. 22 с.

6. *Асгар Абди* Современная культурная глобализация: динамика и политические последствия (на примере Исламской республики Иран): Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун–т. Минск, 2016. 24 с.

7. *Волков Г. Ю.* Субъекты глобализации и их влияние на национальные государства: Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.04 / Акад. упр-ия при Презид. Респ. Беларусь. Минск, 2011. 19 с.

8. *Гринева О. Н.* Политика нейтралитета в условиях глобализации: Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун–т. Минск, 2007. 20 с.

9. *Кизима С. А.* Развитие национального государства в условиях глобализации: геополитический аспект: Автореф. дис. … д-ра полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун–т. Минск, 2009. 43 с.

10. *Малевич Ю. И.* Эволюция концептуальных подходов к правам человека в условиях глобализации: Автореф. дис. … д-ра полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун–т. Минск, 2005. 38 с.

11. *Барахвостов П. А.* Инициатива "Восточное партнерство" во внешней политике Европейского Союза (2009-2017 гг.): Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун–т. Минск, 2018. 27 с.

12. *Веремеев Н. Ю.* Трансформация государственного суверенитета в условиях интеграции Европейского союза: Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун–т. Минск, 2009. 19 с.

13. *Достанко Е. А.* Европейское сообщество государств как международная система: процессы реструктуризации на рубеже XX–XXI ст.: Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун–т. Минск, 1998. 22 с.

14. *Кузнецова И. С.* Общая политика безопасности и обороны Европейского Союза: концептуальные и практические аспекты: Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.04 / Акад. упр-ия при Презид. Респ. Беларусь. Минск, 2011. 23 с.

15. *Шевченко А. В.* Межгосударственная интеграция – стратегическое направление развития Содружества Независимых Государств: Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун–т. Минск, 2001. 20 с.

16. *Матусевич Е. В.* Национально-государственные интересы Республики Беларусь в контексте процесса глобализации: Автореф. дис. … д-ра полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун–т. Минск, 2005. 33 с.

17. *Есин Р. О.* Политика трансграничного сотрудничества Республики Беларусь в европейской перспективе: региональное измерение: Автореф. дис. … д-ра полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун–т. Минск, 2012. 40 с.

18. *Горелик А. А.* Внешнеполитическая деятельность белорусского парламента в современных условиях: Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.02 / Акад. упр-ия при Презид. Респ. Беларусь. Минск, 2016. 22 с.

19. *Голубничий Д. В.* Евразийский экономический союз и Европейский Союз в геостратегии Республики Беларусь: Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.04 / Акад. упр-ия при Презид. Респ. Беларусь. Минск, 2020. 22 с.

20. *Ломов С. А.* Геополитический аспект национальной безопасности Республики Беларусь: Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун–т. Минск, 2008. 21 с.

21. *Любкин Д. Н.* Сотрудничество Республики Беларусь с Европейским Союзом по обеспечению пограничной безопасности: Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.04 / Акад. упр-ия при Презид. Респ. Беларусь. Минск, 2021. 22 с.

22. *Писарчик А. С.* Глобальные вызовы современности: воздействие на национальное государство и его внешнеполитические приоритеты (на примере Республики Беларусь): Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун–т. Минск, 2018. 25 с.

23. *Сакович В. А.* Влияние интеграции и глобализации на социально–политический выбор трансформирующихся государств (на примере Республики Беларусь и Республики Молдова): Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун–т. Минск, 2002. 20 с.

24. *Свиридов А. В.* Геополитическое пространство Республики Беларусь в условиях глобализации: информационное и политическое измерения: Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.04 / Бел. гос. ун–т. Минск, 2015. 23 с.

25. *Серебряков В. О.* Экономическая дипломатия во внешней политике Республики Беларусь (на примере государств Юго-Восточной Азии): Автореф. дис. … канд. полит. наук: 23.00.04 / Акад. упр-ия при Президе. Респ. Беларусь. Минск, 2021. 24 с.